СОЮЗ ЕВРАЗИЯ

Родная газета на роднай мове

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

ЗВЯЗДА

8 ЖНІЎНЯ 2017 г. АЎТОРАК №150 (28514)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Дзе збіраюць сапраўдны беларускі «Кадылак»?



У пошуках тульскіх скарбаў

Як прайшоў «Рыцарскі фэст – 2017»

СТАР. 13

ЦЫТАТА ДНЯ

Анатоль ЧОРНЫ, міністр архітэктуры і будаўніцтва:

«Іпатэчнае крэдытаванне ў Беларусі можа запрацаваць на працягу года. Цяпер дапрацоўваюцца механізмы рэгулявання некаторых пытанняў — у прыватнасці, механізм канфіскацыі жылля ў тым выпадку, калі чалавек не можа выплачваць іпатэку. Важна, як будуць канфіскоўвацца кватэры пры немагчымасці пагашэння доўгу. Гэтае пытанне будзе хутка дапрацавана, думаю, гэта перспектыва аднаго года. Хачу адзначыць, што перад галіной стаіць таксама задача па зніжэнні сабекошту будаўніцтва. Кошт квадратнага метра па дзяржпадтрымцы — 840 рублёў, наша задача выйсці на паказчык, пры якім кошт квадратнага метра будзе роўны сярэдняй заработнай плаце, мы блізкія да яго».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 08.08.2017 г.

Долар ЗША	1,9508	▲
Еўра	2,2993	▼
Рас. руб.	0,0324	▲
Укр. грыўня	0,0757	▲

ISSN 1990 - 763X

САБРАЦЬ І ЗБЕРАГЧЫ

Пазбегнуць надзвычайных сітуацый на ўборцы

Фота Надзеі БУЖАН.

Жніво зараз у самым разгары. Аднак варта не толькі ўбраць, але і зберагчы збожжа. Датычыцца гэта як палёў, так і зернесушыльных комплексаў. Карэспандэнты «Звязды» выехалі ў рэйд разам з супрацоўнікамі Мінскага раённага ўпраўлення па надзвычайных сітуацыях, каб пабачыць, як жа гэта робіцца.

«На пачатку нулявых знайсці вогнетушыцель у кабіне было цяжка»

Бяскрайнія палі зіхацяць жоўтым колерам. Паблізу вёскі Табары ўбіраюць рапс. Аднак гэтай раніцай 21 камбайн агракамбіната «Дзяржынскі» пакуль што стаіць на прыколе. Уначы прайшоў даволі моцны дождж, таму механізатары чакаюць, пакуль сонца падсушыць палеткі. І разам з тым аглядаюць сваю тэхніку.

— Першапачаткова ўсе спецыялісты, занятыя на ўборцы ўраджаю, праходзяць інструктаж па тэхніцы бяспекі на прадпрыемстве, — кажа **начальнік Мінскага раённага аддзела па надзвычайных сітуацыях Дзяніс ЖЫЛКО.** Нашы супрацоўнікі штодня наведваюць месцы ўборкі і нагадваюць аб правілах пажарнай бяспекі падчас жніва. Мы звяртаем увагу на тыя часткі камбайна, якія круцяцца і трупцца — яны і з'яўляюцца пажаранебяспечнымі. Жняярка забіваецца за некалькі гадзін работы, таму ў камбайне абавязкова павінна быць рыдлёўка для яе ачысткі. Акрамя таго, мы правяраем, каб не падцякалі масла і паліва. І, зразумела, правяраем наяўнасць сродкаў сувязі і вогнетушыцель.

Як толькі звяно камбайнаў выходзіць у поле, там абавязкова пачынае дзяжурыць пажарны аўтамабіль. З усімі вадзіцелямі падтрымліваецца мабільная сувязь. Па рэгламенце, калі механізатар убачыць, што недзе пачаў курыцца дымок, ён павінен выклікаць нашу машыну. Аднак здараюцца няштатныя сітуацыі даволі рэдка.

— Рапс, які мы ўбіраем, адразу стагуецца, а следам збіраецца і салома, — заўважае **начальнік аддзела працы і тэхнікі бяспекі агракамбіната «Дзяржынскі» Дзяніс ЛЯВЕР.** — Пажніўныя астаткі заворваюцца ў гэты ж дзень. Тым самым мы вырашаем адразу некалькі задач. Па-першае, пажніўныя астаткі загарэцца ўжо не могуць. А па-другое, мы атрымліваем дадатковае ўгнаенне. Што да дзяжурстваў пажарных аўтамабіляў, то кіраўніцтва кожнай гаспадаркі само вырашае, ці заказваць ім гэтую паслугу. Мы вырашылі заключыць дагавор найму з Мінскім раённым аддзелам па надзвычайных сітуацыях — нам так і прасцей, і спакайней. Ды і калі методыка ўжо адпрацавана, то людзі ведаюць, што рабіць пры няштатных сітуацыях.

СТАР. 4

■ Фармацэўтыка

ФАЛЬСІФІКАТ? ГЭТА НЕМАГЧЫМА

На айчынным рынку прадстаўлена толькі якасная фармацэўтычная прадукцыя

У нашай аптэчнай сетцы немагчыма купіць фальсіфікат. Калі мець на ўвазе легальны гандаль, то такія лекі трапіць у яго проста не могуць. Іншая рэч, шмат безрэцэптурных лекаў прадаецца цяпер праз інтэрнэт — і тут можна, што называецца, трапіць...

З аднаго боку, легальны інтэрнэт-продаж лекаў сапраўды існуе, адпаведная практыка дзейнічае ў шэрагу краін. Гэта азначае, што ліцэнзаваная аптэка замежнай краіны зарэгістравалася на сайце ўпаўнаважанага органа (напрыклад, міністэрства аховы здароўя) і атрымала спецыяльны знак. Выйсці на такую аптэку можна непасрэдна з сайта таго самага органа аховы здароўя. Аднак ведаюць аб гэтым далёка не ўсе, чым і карыстаюцца некаторыя несумленныя грамадзяне. Прадстаўнікі Міністэрства аховы здароўя Беларусі не так даўно адшукалі ў інтэрнэце незарэгістраваны ў нас сродак для лячэння эрэктыльнай дысфункцыі — прапаноўваў яго адзін расійскі сайт — і вырашылі правесці кантрольную закупку.

СТАР. 4

Да 100-годдзя «ЗВЯЗДЫ» застаўся 1 дзень

На ўсе 100!!!

100 гадоў пішам пра тое, што сапраўды важна. Заставайцеся з намі – будзе цікава! Падпісацца на «Звязду» можна заўсёды.

У РАЁНЫ — ЛЕПШЫЯ СІЛЫ

Кадравы дзень прайшоў у Палацы Незалежнасці

Уборачная кампанія, сельскагаспадарчыя асаблівасці розных рэгіёнаў, імідж улады... На гэтых пытаннях засяродзіў увагу Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падчас назначэнняў на важныя дзяржаўныя пасады.

Так, у Віцебскай вобласці назначаны першы намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама, а таксама старшыні Аршанскага і Бешанковіцкага райвыканкамаў. У Брэсцкай вобласці назначаны новыя старшыні Ганцавіцкага і Драгічынскага райвыканкамаў, у Мінскай — старшыня Салігорскага райвыканкама, у Магілёўскай — Асіповіцкага і Хоцімскага райвыканкамаў.

АСАБЛІВАСЦІ ЎБОРАЧНАЙ

На днях кіраўнік дзяржавы плануе наведаць Брэсцкую вобласць. Безумоўна, асаблівую ўвагу ён зверне на збор ураджаю. Прынамсі, пра гэта ўжо казалася падчас селектарнай нарады, якая прайшла на мінулым тыдні.

— Пагляджу, як ідзе ўборка, — паведаміў ён. — Для Брэста гэта найважнейшае пытанне, нягледзячы на тое, што вы ўжо фактычна палову ўраджаю ўбралі. Спадзявацца на тое, што ў жніўні—верасні будзе сонечнае надвор'е, не прыходзіцца. Вы самі разумееце, што ўборачны дзень стаў больш кароткі, таму што раса сыходзіць вельмі позна — амаль да 11 гадзін.

Гэта ўплывае на вільготнасць збожжа, адпаведна, неабходна яго сушыць. Не факт, што зернесушылак будзе дастаткова: спатрэбіцца тэхніка, каб перавезці ўраджай на іншыя зернесушыльныя комплексы, у тым ліку хлебакамбінатаў. Трэба рабіць усё магчымае, каб не страціць ураджай.

— Перакідка тэхнікі асабліва актуальная на сённяшні дзень, — падкрэсліў Прэзідэнт. — Асабліва Віцебская вобласць, поўнач Мінскай, Магілёўскай вобласці. Каб не было шапказакідальніцтва — маўляў, убяром. Вы павінны гэта ўлічыць і перадаць губернатарам. Нам трэба планаваць гэтыя мерапрыемствы.

КОЖНЫ РЭГІЁН — АСАБЛІВЫ

Гаворачы пра паўночны рэгіён — Віцебскую вобласць, Прэзідэнт звярнуўся да неабходнасці распрацоўкі новай структуры пасяўных плошчаў:

— Трэба вырошчваць збожжавыя там, дзе яны дадуць добры эфект. А дзе не — трэба пераходзіць на травы, малочную жывёлагадоўлю. Трэба пустуючыя ўчасткі займаць дробнай рагатай жывёлай, вырабляць ялавічыну, ствараць статкі і выпасваць з мая да кастрычніка на поймах і ў іншых месцах. У вас іх больш, чым неабходна. Чаму на Захадзе, у Амерыцы гэтым карыстаюцца, а мы не хочам? Гэта характэрна для ўсіх, але для вас перш за ўсё. У вас ёсць зіма, для таго, каб падумаць, якія ў вас будуць севазвароты і якая будзе структура пасяўных плошчаў. Гэта для Віцебскай вобласці вельмі важна.

Некалькі месяцаў таму Прэзідэнт ужо назначаў новага кіраўніка Аршанскага райвыканкама. На жаль, чалавек зразумеў, што з-за стану здароўя не можа займаць такую адказную пасаду. Таму ўчора на гэту пасаду кіраўнік дзяржавы назначыў Аляксандра Пазняка, які дагэтуль працаваў памочнікам Прэзідэнта — інспектарам па Віцебскай вобласці. Для яго пастаўлена сур'ёзная задача:

— Вы разумееце, што сёння Орша не проста на слыху. Такіх у нас некалькі рэгіёнаў, і на прыкладзе Оршы мы павінны паказаць, як будзем іх развіваць. Накіроўваць туды новага чалавека, збоку — значыць адцягнуць мінімум на паўгода рэканструкцыю Аршанскага рэгіёна. Яго рэканструяваць, мадэрнізаваць патрэбна. А вы — чалавек, які ў гэта пагружаны. Гэта вам прэзідэнцкае даручэнне.

Аляксандр Лукашэнка прызнаўся, што бывае на Аршаншчыне па некалькі разоў на год.

— Вельмі сур'ёзны рэгіён, побач з Расійскай Федэрацыяй. Гэта наш рынак, гэта нашы сябры, нашы браты, вельмі шчыльнае супрацоўніцтва, найважнейшы чыгуначны вузел, гэта напрамак Берлін—Масква, там усё сканцэнтравана. Таму рашайце гэту праблему. Неабходна вырваць гэты рэгіён з ціскоў няўдачнікаў і падняць на больш высокі ўзровень.

НЕ РЭЗАЦЬ ПА ЖЫВЫМ

Назначаючы кіраўніком Салігорскага райвыканкама Алега Паскробку, першага намесніка міністра жыллёва-камунальнай гаспадаркі, Прэзідэнт таксама паставіў яму канкрэтную задачу.

— Што да Салігорска, то вы ведаеце, што там адбылося з кіраўніком, таму вам прыйдзецца падымаць імідж улады ў Салігорскім раёне, — заявіў Аляксандр Лукашэнка. — І потым, мы губляем аднаго з дзейных супрацоўнікаў групы, якая займаецца рэформай ЖКГ. Я буду рады, калі вы мне пакажаце новы ўзор рэфармавання жыллёва-камунальнай гаспадаркі. Толькі не нейкімі там завоблачнымі прапановамі, яны нам непатрэбны. Нам трэба ўсё лепшае ўзяць з таго, што ёсць, і стварыць новую мадэль функцыянавання і кіравання жыллёва-камунальным комплексам. За вамі гэта пытанне пакуль застанецца.

Гаворачы пра раёны Магілёўскай вобласці, куды таксама назначаюцца новыя старшыні, кіраўнік дзяржавы прызнаўся, што плануе наведаць і Асіповіцкі, і Хоцімскі раёны.

Напрыканцы Прэзідэнт заявіў:

— Вы не ў просты час прыходзіце да кіраўніцтва пярвічным звяном кіраўніцкай вертыкалі. Я вас вельмі прашу здзяйсняць свае ўладныя паўнамоцтвы ў поўным аб'ёме, каб я лішні раз не нагадваў пра тое, што вы — старшыня райвыканкама і адказваеце за функцыянаванне гэтых тэрыторый. Разбярыцеся, з кім будзеце працаваць. Калі людзі ўжо закасцянелі ўвогуле, ад іх трэба пазбаўляцца. Калі захочаце некаму даць шанц, будзе вельмі нядрэнна. Я ўвогуле прыхільнік таго, каб не рэзаць па жывым, розныя прычыны могуць быць, розныя стылі кіраўніцтва да вас, таму дайце людзям шанц. Але гэты шанц не можа расцягнуцца на гады або доўгія месяцы. Гэта літаральна месяц-два.

Асобную ўвагу старшыні райвыканкамаў павінны ўдзяліць праблемным гаспадаркам. Менавіта пра гэта, папярэдзіў Аляксандр Лукашэнка, ён будзе пытацца ў першую чаргу падчас паездак па рэгіёнах.

Надзея ЮШКЕВІЧ.
yushkevich@zviazda.by

Кіраўнік дзяржавы назначыў:

РЫБАКОВА Валянціна Барысавіча — пастаянным прадстаўніком Беларусі пры Арганізацыі Аб'яднаных Нацый.

Прэзідэнт таксама даў згоду на назначэнне:

БЯЛОВА Уладзіміра Уладзіміравіча — старшынёй Ганцавіцкага райвыканкама;

ДАРАШЭНКІ Аляксандра Вітальевіча — старшынёй Драгічынскага райвыканкама;

МАЦКЕВІЧА Алега Сяргеевіча — першым намеснікам старшыні Віцебскага аблвыканкама;

БУЛАЎКІНА Андрэя Анатольевіча — старшынёй Бешанковіцкага райвыканкама;

ПАЗНЯКА Аляксандра Рыгоравіча — старшынёй Аршанскага райвыканкама;

ПАСКРОБКІ Алега Рыгоравіча — старшынёй Салігорскага райвыканкама;

НАЛІВАЙКІ Паўла Уладзіміравіча — старшынёй Асіповіцкага райвыканкама;

РУБАНА Дзмітрыя Міхайлавіча — старшынёй Хоцімскага райвыканкама;

ДАПКЮНАСА Андрэя Вадзімавіча — намеснікам міністра замежных спраў;

КОРБУТА Аляксандра Мікалаевіча — намеснікам міністра прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя;

БАРАВУЛІ Аляксандра Іванавіча — намеснікам міністра спорту і турызму;

МАРЧАНКІ Аляксандра Анатольевіча — генеральным дырэктарам ААТ «Барысаўскі завод аўтатрактарнага электраабсталявання» — кіруючая кампанія холдынга «Аўтакампаненты»;

АЗАРАВА Генадзя Пятровіча — генеральным дырэктарам ААТ «Віцязь»;

ПАЦКЕВІЧА Сяргея Сцяпанавіча — генеральным дырэктарам ААТ «Мінскі завод шасцерняў»;

МАРЦУЛЯ Анатоля Яўгенавіча — генеральным дырэктарам ААТ «МВАВТ»;

КУБРАКОВА Івана Уладзіміравіча — членам Віцебскага аблвыканкама;

КЛІШЭВІЧА Сяргея Міхайлавіча — членам Мінскага гарвыканкама.

Быць у эліце спартыўнай гімнастыкі

Беларусь плануе вярнуць свае ранейшыя пазіцыі ў гэтым відзе спорту

У нашай краіне спорту традыцыйна аддаецца асаблівая ўвага, прычым самым розным яго відам. Учора кіраўнік дзяржавы сустрэўся з прэзідэнтам Міжнароднай федэрацыі гімнастыкі Марынары Ватанабэ.

Днямі ў Мінску прайшоў этап Кубка свету па мастацкай гімнастыцы.

— Я найпадрабязнейшым чынам інфармаваны пра ўсе падзеі апошніх трох сутак у Беларусі, асабліва што датычыцца нашага спорту, мастацкай гімнастыкі, — прызнаўся кіраўнік дзяржавы. — Я вельмі ўдзячны за падзею, якая адбылася ў Мінску.

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што мастацкая гімнастыка — гэта той від спорту, дзе яшчэ вельмі шмат суб'ектывізму. Ён выказаў спадзяванне, што спадар Ватанабэ можа пераламіць гэту тэндэнцыю.

— Вы, відаць, упэўніліся, што Беларусь трымае слова, — звярнуў увагу кіраўнік краіны. — Гэта адказная краіна, і ўсе нашы людзі, якія спрычынены — у прыватнасці, да мастацкай гімнастыкі, — таксама трымаюць сваё слова. Я вам хачу цвёрда паабяцаць, што ў гэтым працэсе, на гэтым шляху вы заўсёды знойдзеце падтрымку Беларусі і можаце ёй скарыстацца ў любы час. Мяркую, што так думаю не толькі я. Так думае пераважная колькасць спецыялістаў, спартсменаў, трэнераў, якія непасрэдна займаюцца гімнастыкай.

У той жа час ёсць і іншыя кірункі для супрацоўніцтва Беларусі і Міжнароднай федэрацыі гімнастыкі.

— Я вельмі разлічваю, што вы нам дапаможаце вярнуцца ў эліту спартыўнай гімнастыкі, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Вы ведаеце, што ў нас была цудоўная школа, але, на жаль, мы яе страцілі — у адрозненне ад Японіі, краіны, якая была на вяршыні і засталася на гэтай вяршыні.

Яшчэ адзін нюанс, якому ўдзяліў увагу кіраўнік краіны — асаблівасці сучаснай мастацкай гімнастыкі:

— Можа быць, вам удасца мастацкую гімнастыку павярнуць у бок мастацтва. Я калі гляджу мастацкую гімнастыку і бачу лірычныя, спакойныя практыкаванні... Гэта сапраўдная мастацкая гімнастыка. А там, дзе патрэбны звышчалавечыя намаганні — гэта адштурхоўвае і спартсменаў, і асабліва бацькоў.

Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Марынары Ватанабэ, які родам з Японіі і які даволі працяглы час быў генеральным сакратаром Японскай асацыяцыі гімнастыкі, з паспяховым выступленнем на этапе Кубка свету па мастацкай гімнастыцы японскіх спартсменаў.

— Вы за кароткі прамежак часу дасягнулі вельмі высокіх рэзультатаў. Таму вы нас навучаеце спартыўнай гімнастыцы, а мы вам дапамагаем у мастацкай гімнастыцы. Добры абмен будзе — разам будзем трэніравацца, — прапанаваў беларускі лідар.

У канцы свайго ўступнага слова Аляксандр Лукашэнка ўручыў спадару Ватанабэ ганаровы знак Нацыянальнага алімпійскага камітэта Беларусі «За заслугі ў развіцці алімпійскага руху ў Рэспубліцы Беларусь». На сустрэчы прысутнічала і Нэлі Кім, віцэ-прэзідэнт Міжнароднай федэрацыі гімнастыкі, намеснік старшыні Беларускай асацыяцыі гімнастыкі. У свой час яна трэніравала нацыянальную зборную нашай краіны па спартыўнай гімнастыцы, з'яўляецца заслужаным трэнерам Рэспублікі Беларусь. Кіраўнік дзяржавы ўручыў ёй ордэн Нацыянальнага алімпійскага камітэта Рэспублікі Беларусь.

Надзея ЮШКЕВІЧ.
yushkevich@zviazda.by

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

Бюджэту ЕС з-за Brexit штогод будзе не хапаць 10-12 мільярдаў еўра

Аб гэтым заявіў еўракамісар па бюджэце Гюнтэр Этынгер. Паводле яго слоў, у падобных умовах блоку давядзецца прымаць больш жорсткія меры эканоміі. «У доўгатэрміновай перспектыве з-за Brexit у бюджэце ЕС будзе не хапаць ад 10 да 12 мільярдаў еўра ў год. Я сыходжу з таго, што гэтыя мільярды будуць кампенсавацца эканоміяй і больш высокімі ўнёскамі краін-членаў», — цытуе Этынгера РІА «Навіны». Нагадаем, напярэдадні газета The Telegraph даведалася пра гатоўнасць брытанскага ўрада заплаціць Еўрасаюзу 40 мільярдаў еўра, каб пагасіць свае фінансавыя абавязацельствы ў сувязі з выхадам з ЕС.

Пры спробе ваеннага перавароту ў Венесуэле былі забітыя двое чалавек

Прэзідэнт Венесуэлы Нікалас Мадура ў сваёй штотыднёвай тэлепраграме назваў паўстанцаў «наймітамі», паведамляе Reuters. Прэзідэнт расказаў, што каля 20 узброеных мужчын ўвайшлі на тэрыторыю вайсковай базы «Фуэртэ-Парамакай» каля Валенсіі перад світаннем, што стала нечаканасцю для канвойных, і накіраваліся да склада са зброяй. Як паведаміў Мадура, двое з тых, хто нападаў, былі забітыя ў перастрэлцы з салдатамі. Па інфармацыі чыноўнікаў кіруючай Адзінай сацыялістычнай партыі, яшчэ восем мяцежнікаў, сярод якіх было трое вайскоўцаў, арыштаваныя.

Кітай і краіны АСЕАН зацвердзілі праект кодэкса паводзін у Паўднёва-Кітайскім моры

Міністры замежных спраў Кітая і краін Асацыяцыі дзяржаў Паўднёва-Усходняй Азіі (АСЕАН) зацвердзілі рамачны праект кодэкса паводзін бакоў у Паўднёва-Кітайскім моры. Пра гэта паведаміла агенцтва «Сіньхуа». Увогуле Кітай і АСЕАН займаюцца выпрацоўкай кодэкса паводзін бакоў у Паўднёва-Кітайскім моры 15 гадоў. Пекін на працягу дзесяцігоддзяў вядзе спрэчкі з некалькімі краінамі Азіяцка-Ціхаакіянскага рэгіёна з нагоды тэрытарыяльнай прыналежнасці шэрагу астравоў у гэтай акваторыі. Гаворка ідзе пра архіпелаг Сіша, астравы Наньша і Хуан'янь. У гэтую спрэчку ў той ці іншай ступені ўцягнутыя В'етнам, Бруней, Малайзія і Філіпіны.

Петыцыя супраць прысваення Брыжыт Макрон статусу першай дамы сабрала звыш 150 тыс. подпісаў

Аўтарам петыцыі стаў мастак Цьеры Поль Валета, які прадстаўляе сябе як «неабыякавага грамадзяніна» Францыі. «Няма ніякіх важкіх падстаў для таго, каб жонка кіраўніка дзяржавы атрымлівала за сваё становішча грошы з дзяржаўнай казны, мы не згодныя з такім статусам», — піша Валета. Ён адзначае, што «цяпер Брыжыт Макрон ужо мае двух-трох памочнікаў, двух сакратароў і двух ахоўнікаў — і гэтага дастаткова».

■ Адкрыцці

РЭЧАВЫЯ ПАЦВЯРДЖЭННІ «АПОВЕСЦІ МІНУЛЫХ ГАДОЎ»

Іх знайшлі магілёўскія археолагі ў Слаўгарадскім раёне

Студэнты МДУ імя Куляшова пад кіраўніцтвам старшага выкладчыка кафедры археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін універсітэта, магістра гістарычных навук Аляксея АЎЛАСОВІЧА працягваюць свае даследаванні ў Слаўгарадскім раёне. Але нават таго, што ім ужо ўдалося знайсці, хапае на сенсацыю.

За дзень даводзіцца перавярнуць тоны пяску.

Дагэтуль вучоныя ніяк не маглі сысціся ў меркаванні, дзе ўсё ж такі адбылася гістарычная бітва, датаваная 984 годам, паміж войскам Уладзіміра Чырвонае Сонейка на чале з ваяводам па мянушцы Воўчы хвост і радзімічамі, апісаная летапісцам Нестарам у «Аповесці мінулых гадоў». Бо рэчка Пясчанка, якую згадвае ста-



Каштоўныя здабыткі.

радаўні манах, чыста ўмоўны арыенцір. Паводле сведчання Аляксея Аўласовіча, цяпер з вялікай доляй верагоднасці можна казаць пра тое, што месца бітвы — тэрыторыя сучаснага Слаўгарадскага раёна, а не Браншчыны ці Гомельшчыны, якія таксама разглядаліся ў якасці патэнцыйных пляцовак для бітвы, бо там ёсць сугучныя па назве рэчкі.

— Знойдзены намі ў адным з курганных могільнікаў паясны набор княжацкага дружынніка — яскравае сведчанне на карысць «слаўгарадскага» варыянта, — кажа гісторык. — І хоць пахаваны воін далекавата ад месца легендарнай бітвы, не выключана, што ён меў да яе непасрэднае дачыненне. Астанкі дружынніка былі крэміраваныя, як таго патрабуюць паганскія традыцыі. Да гэтага можна дадаць той факт, што тры гады таму пад Слаўгарадам быў знойдзены незвычайны артэфакт — камень з выявай княжацкага трызубца. Значыць, у канцы дзясятага стагоддзя тут ужо, кажучы сучаснай мовай, існавала адміністрацыя князя Уладзіміра Чырвонае Сонейка. Яна збірала даніну з мясцовых плямёнаў радзімічаў, чые землі пасля бітвы каля ракі Пясчанкі ўвайшлі ў склад Кіеўскай Русі.

У спісе ўнікальных здабыткаў магілёўскіх археолагаў — керамічны комплекс, які датуецца X—XI стагоддзямі, срэбны дырхем з арабскай вязню. Яшчэ ў адным кургане археолагі знайшлі два жаночыя пахаванні. На думку Аляксея Аўласовіча, яны адносяцца прыблізна да таго ж дзясятага стагоддзя. «Калі адна жанчына была крэміраваная, то другая — пахаваная па хрысціянскім абрадзе. Час, калі яны былі адданыя зямлі, «падказаў» яшчэ і пярсцёнак адной з іх», — удакладняе ён.

Вядома, канчатковыя вывады будуць зроблены пасля падрабязнага вывучэння артэфактаў. Аднак ужо сёння можна казаць, што такія рэчы археолагі знаходзяць даволі рэдка. Ды і падняць іх праз стагоддзі з глыбінь зямлі складана. Студэнтам гісторыка-філалагічнага факультэта за дзень даводзіцца пераварочваць тоны пяску. Але гэта не палохае будучых гісторыкаў. Шмат хто з іх пасля абавязковай трохдзённай адпрацоўкі прадоўжылі раскопкі, можна казаць, на валанцёрскіх пачатках. Антон Цярэшчанка і Яўген Гарбачэўскі з іх ліку.

— Уласнымі рукамі дакрануцца да гісторыі і нават упісаць у яе сваю старонку — дзеля гэтага, пагадзіцеся, можна і трэба зрабіць усе магчымае, — выказаў думку большасці таварышаў па экспедыцыі Яўген Гарбачэўскі.

Калі вучоныя Акадэміі навук краіны пацвердзяць асноўную версію аб месцы гістарычнай бітвы княжацкай дружыны з радзімічамі каля ракі Пясчанкі, падручнік па гісторыі Беларусі дапоўняць новымі фактамі. І, як лічаць магілёўскія археолагі, адной рэдакцыяй справа не абмяжуецца. Наша зямля, як высвятляецца, захоўвае яшчэ шмат таямніц.

Нэлі ЗІГУЛЯ. *zigulya@zviazda.by*

■ Надвор'е

Цяпло вернецца з дажджамі і градам

Пасля кароткага перапынку ў Беларусь зноў прыйдзе спёка. Пра гэта паведамляюць у Рэспубліканскім цэнтры па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды. У першай палове тыдня надвор'е на тэрыторыі краіны будзе ў асноўным вызначаць зона павышанага атмасфернага ціску, яна і прынясе высокую тэмпературу.

Сёння, у аўторак, будзе пераважна без ападкаў. Толькі ноччу ў асобных раёнах Гомельскай вобласці пройдуць кароткачасовыя дажджы, магчымыя навальніцы. Ноччу і ранкам месцамі чакаецца слабы туман. Ноччу тэмпература паветра складзе 8—14 градусаў, удзень — 22—28 цяпла.

Заўтра ападкі таксама не прагназуюцца. Ноччу месцамі магчымы слабы туман. Тэмпература паветра ў цёмны час сутак складзе 8—15 градусаў вышэй за нуль, удзень — 23—29, у асобных раёнах Брэсцкай вобласці слупок тэрмометра пакажа +30.

Пасля гэтага ў Беларусь прыйдуць паўднёвыя вятры, і ў краіну пачнуць паступаць яшчэ больш цёплыя паветраныя масы з паўднёвых шырот, а тэмпература стане паступова павышацца. Большая частка краіны застанецца ў вобласці высокага атмасфернага ціску, а на паўночным захадзе будзе заўважны ўплыў атмасфернага фронту з Заходняй Еўропы.

У чацвер у асобных раёнах па паўночным захадзе краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы, магчымы навальніцы. Ноччу месцамі слабы туман. У цёмны час сутак слупок тэрмометра падымецца да адзнакі 11—18 вышэй за нуль, удзень — да 24—29 градусаў. На паўднёвым захадзе ноччу чакаецца 19—20, удзень — 30—34.

Паводле папярэдніх прагнозаў, канец тыдня будзе багатым на дажджы. У пятніцу яны пройдуць пераважна на паўночным захадзе краіны, тэмпература ўначы 15—21, удзень — 26—32, па поўдні — да плюс 34. У суботу па захадзе магчымы дажджы і навальніцы, днём у асобных раёнах залевы з узмацненнем ветру парывамі да 15—20 метраў за секунду і градам. Ноччу тэрмометр будзе паказваць 15—21, удзень — 27—34, месцамі па паўночным захадзе — плюс 20—26. У нядзелю атмасферы фронт будзе рухацца ў бок усходу і прынясе дажджы з навальніцамі, моцным ветрам і градам на большую частку тэрыторыі краіны. Прагназуецца кантрасная тэмпература: уначы 13—20, удзень ад 19—21 па паўночным захадзе да 29—31 па ўсходзе.

Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ. *lyskavets@zviazda.by*

■ Занятасць

На замежныя вакансіі

Выраслa колькасць беларусаў, якія ездзяць на работу ў Польшчу

Такую статыстыку прыводзіць праграма «Ла Страда». Калі ў 2013 годзе сярод абанентаў інфалініі па бяспечным выездзе і знаходжанні за мяжой «113» толькі восем працэнтаў выбіралі Польшчу для працаўладкавання, то летась такіх было 22 працэнты.

Большасць жа працоўных мігрантаў традыцыйна ездзіць у Расію. Праўда, калі ў 2013-м работай у гэтай краіне цікавіліся 53 працэнты абанентаў, то ў 2016-м амаль удвая менш — 27 працэнтаў.

— Магчыма, гэта звязана з тым, што ў Расіі працягваецца крызіс і працоўных месцаў больш не становіцца, — лічыць **кіраўнік праграмы «Ла Страда» Алена НЕСЦЯРУК.** — Акрамя таго, Польшча стараецца прыцягваць спецыялістаў менавіта з блізкіх краін, стварaючы спрыяльныя ўмовы.

Павелічэнне колькасці працоўных мігрантаў, што з'язджаюць у Польшчу, пацвярджае і той факт, што з мінулага года з'явіліся 32 новыя фірмы і ІП, якія маюць ліцэнзію на працаўладкаванне грамадзян за мяжой і прапануюць паслугі па пошуку работы менавіта ў Польшчы. Для параўнання: усяго ў Беларусі працуе 38 ліцэнзіятаў, якія займаюцца пасярэдніцтвам у працаўладкаванні ў польскім рэгіёне.

У цэлым у топ-5 геаграфічных пераваг патэнцыйных мігрантаў уваходзяць Польшча (12,4%), Расія (9%), Германія (8,2%), Італія (4,8%) і Турцыя (4,4%). Звяртаюцца на інфалінію і ахвотныя прыехаць у Беларусь — такіх абанентаў 13,9 працэнта.

Па ацэнках Інстытута сацыялогіі пры НАН Беларусі, цяпер работу за мяжой шукаюць каля 8—10 працэнтаў беларусаў.

Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.
lubneuskaya@zviazda.by

ФАКТЫ

КАЛІ ВУЧЫЦЦА, А КАЛІ АДПАЧЫВАЦЬ?

У Міністэрстве адукацыі расказалі, як будуць адпачываць школьнікі ў 2017/2018 навучальным годзе, каб бацькі маглі загадзя спланаваць іх канікулярны час.

Першая вучэбная чвэрць будзе доўжыцца ў беларускіх школах з 1 верасня па 28 кастрычніка. Другая — з 8 лістапада па 23 снежня. Трэцяя — з 8 студзеня па 24 сакавіка, а чацвёртая — з 2 красавіка па 31 мая.

Такім чынам, працягласць асенніх канікулаў складзе 10 дзён (з 29 кастрычніка па 7 лістапада ўключна). Зімой школьнікі будуць адпачываць 15 дзён (з 24 снежня 2017 года па 7 студзеня 2018 года) і вясной — 8 дзён (з 25 сакавіка па 1 красавіка).

Для навучэнцаў першых і другіх класаў у трэцяй вучэбнай чвэрці прадугледжаны дадатковыя зімовыя канікулы (з 12 па 18 лютага 2018 года) агульнай працягласцю 7 дзён. Летнія канікулы стартуюць для беларускіх школьнікаў 1 чэрвеня. Апошні дзень адпачынку — 31 жніўня. Такім чынам працягласць летніх канікулаў складзе 92 дні.

Надзея НІКАЛАЕВА. *nikalaeva@zviazda.by*

ПЯСОК НІКУДЫ НЕ ЗНІКАЕ...

У мастацкай галерэі «Універсітэт культуры» ў Палацы Рэспублікі заўтра пачынае сваю работу выстаўка пясочнай графікі.

Творы, выкананыя ва ўнікальнай тэхніцы, прадстаўляюць майстры не толькі з Беларусі, але і з Расіі, Украіны, Літвы, Малдовы. Народжаны ў сярэдзіне XX стагоддзя, гэты від мастацтва спалучыў пясок і шкло. Сама ідэя графічных перамоў з гледачом набыла новы і зусім нечаканы фармат. Вобразы, народжаныя рухамі мастакоў, іх фантазіяй, вывелі святло і цень на новыя вышыні ў гульні і руху колераў.

Выстаўка ў сталічнай галерэі праходзіць пры падтрымцы Аб'яднання пясочных мастакоў «Sand active». Куратар выстаўкі — вядомы беларускі пясочны графік Вольга Радзецкая. У праграме творчага праекта — майстар-класы з удзелам гледачоў, творчыя майстэрні, лекцыі, музычныя вечарыны. Мастакі збіраюцца правесці некалькі заняткаў па пясочнай анімацыі для дзяцей з абмежаванымі магчымасцямі.

Сяргей ШЫЧКО.

ВАДА НЕ ДАРУЕ НЕАСЦЯРОЖНАСЦІ

У выхадныя дні адразу некалькі здарэнняў на вадзе трапілі ў зводкі ратавальнікаў. Патанула маці дваіх дзяцей, жанчына атрымала траўмы, катаючыся на гідрацыкле, мужчына нырнуў і не вынырнуў...

У нядзелю а 12-й гадзіне ў МНС па лініі дзяжурна-дыспетчарскай службы паступіла паведамленне пра тое, што каля вёскі Смычок Буда-Кашалёўскага раёна патанула сям'я.

Відавочцы сталі сведкамі, як на Дняпры праплывалі целы жанчыны і дваіх дзяцей. Кінуўшыся ў ваду, два адпачываўшыя кіроўцы і педагог дзіцячага дома выцягнулі патанулых з вады. Ім удалося адкачаць дзяўчынку і хлопчыка — пагодкаў 3 з паловай і 4 з паловай гадоў. Медыкі, якія прыбылі, канстатавалі смерць іх маці. Дзеці разам з бацькам дастаўлены ў бальніцу.

У гэты ж дзень у раённую бальніцу з траўмамі рознай ступені цяжкасці была дастаўлена жыхарка Драгічына, якая каталася на гідрацыкле. Кіруючы транспартным сродкам, яна сутыкнулася з берагам і ўпала на дрэва.

За дзень да гэтага ў Гродзенскім раёне мужчына пайшоў купацца ў вадаёме каля вёскі Караліно. Дарэчы, на купанне ў гэтым месцы дзейнічае забарона. Нырнуўшы ў ваду, больш на паверхні вады ён не з'яўляўся.

НАВІНЫ

ШУМ У КВАТЭРЫ І РАБАВАННЕ БАНКА

Ад самоты пажылыя людзі бяруць у руку тэлефонную трубку і...

У дзяжурную частку Цэнтральнага РУУС сталіцы паступіла паведамленне з банка аб тым, што ў кантакт-цэнтр звярнулася жанчына і расказала, нібыта кліентка банка плануе злачынства.

— Была ўстаноўлена асоба, якая тэлефанавала, — ёю аказалася пажылая жанчына 1933 года нараджэння. У гутарцы з міліцыянерамі яна прызналася, што пасля смерці мужа адчувае сябе вельмі самотна, а такія званкі дазваляюць ёй мець стасункі з людзьмі, — расказала **афіцыйны прадстаўнік Цэнтральнага РУУС г. Мінска Таццяна АБОЗНАЯ.**

Праз некалькі гадзін у дзяжурную частку паступіла паведамленне ад 82-гадовай пенсіянеркі, якая паскардзілася на староннія шумы ў яе кватэры, выказаўшы здагадку, што ёй перашкаджаюць адпачываць суседзі. На месцы было ўстаноўлена — у жыллі старонніх шумоў няма, а ў ходзе гутаркі жанчына расказала, нібыта апошнім часам яна стала часта чуць староннія гукі. Жыве пенсіянерка адна, ёсць дзеці, унукі, але яны яе не наведваюць...

БТР СУТЫКНУЎСЯ З МІКРААЎТОБУСАМ

Такое здарэнне адбылося ва Украіне з удзелам мікрааўтобуса з нашай краіны ў нядзелю.

У Ровенскай вобласці побач з ваенным палігонам не размінуліся бронетранспарцёр, які пераязджаў дарогу, і мікрааўтобус «Фольксваген». Тры чалавекі, якія былі ў салоне апошняга, атрымалі траўмы, ім была аказана медыцынская дапамога. Ваенныя і кіроўца мікрааўтобуса не пацярпелі.

Сяргей РАСОЛЬКА. *rs@zviazda.by*

САБРАЦЬ І ЗБЕРАГЧЫ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Усяго ў Мінскім раёне працуюць 23 сельскагаспадарчыя прадпрыемствы, — працягвае Дзяніс Жылко. — І нават калі з намі дагавор не заключаецца, мы трэніруем механізатараў, як працаваць з бочкамі, і падчас уборачнай перыядычна маніторым абстаноўку. Вось зараз 12 інспектароў размеркаваны па раёне, і да вечара яны мусяць сабраць інфармацыю, якія прадпрыемствы наведалі, якія парушэнні былі і што з іх удалося ліквідаваць. Напрыклад, любы інспектар можа пад'ехаць да бочкі і папрасіць механізатара даць ваду, тым самым ацаніўшы яго веды, і паглядзець, як працуе тэхніка. Калі згадаць сітуацыю, якая была 15 гадоў таму, то арганізацыі сталі куды больш звяртаць увагу на пажарную бяспеку. На пачатку нулявых часцяком было як: жняярка круціцца, камбайн ідзе — ну, значыць, працаваць тэхніка можа. А знайсці вогнетушыцель у кабіне механізатара трэба было яшчэ пастарацца.

Хлебароб Міхаіл САЛАДУХА за рулём камбайна — дваццаты год. Палі і тэхніку ведае цудоўна. І не дзіўна: у яго паслужным спісе — сем выйграных «Дажынак».

— Гадзіна прастою абыходзіцца больш чым у 10 тон збожжа, — кажа камбайнер. — Менавіта таму самай раніцай мы прадзімаем усе механізмы, каб там не засталося ніякай мякіны. Аглядаем рухавік і механізмы да пачатку працы і адразу пасля абеду. Дзякуючы досведу, усе «гарачыя кропкі» ведаеш ужо на памяць.

«Бункер распаліўся так, што ўначы ўсё было відаць без асвятлення»

Затрымліваць на доўгі час у сонечнае надвор'е камбайнераў мы не можам і таму кіруемся да зернесушыльнага комплексу, які знаходзіцца паблізу вёскі Азярцо. Сушылка патрабуе не меншай увагі за камбайны. Прычына простая — унутры адначасова знаходзяцца сотні тон зерня. Нават невялікае адхіленне ад тэхналагічнага працэсу можа прывесці да «завісання» збожжа і, як вынік, — вялікіх праблем.

Фота Надзеі БУЖАН.

Сушыльны комплекс абсталяваны сістэмай аўтаматычнага кантролю. Калі недзе ўтворыцца затор, і тэмпература пачне расці, то агрэгат адключыцца.

— Пажар на сушылках ускладняецца тым, што не ўся плошча ўзгарання можа быць лёгкадаступнай, — кажа Дзяніс Жылко. — Тут і вышыня ў дзясяткі метраў, і вялікая колькасць самых разнастайных галерэй і трубаправодаў. Аднойчы даводзілася тушыць полымя на сушылцы ў гаспадарцы. Дык бункер з зернем уначы распаліўся так, што ўсё навокал было відаць без асвятлення!

Сушыльны комплекс абсталяваны сістэмай аўтаматычнага кантролю. Калі недзе ўтворыцца затор і тэмпература пачне расці, то агрэгат адключыцца. Аднак толькі на аўтаматыку супрацоўнікі не спадзяюцца. На стэндзе на сцяне невялікага будынка побач з сушылкай вісіць увесь супрацьпажарны інструмент — рыдлёўка, вогнетушыцель, сякера. А непадалёк стаіць цыстэрна з вадой. Усё гэта надзейна абаронена ад дажджу. І разам з тым размешчана так, каб можна было скарыстацца патрэбнай прыладай не губляючы часу.

— За суткі наша сушылка можа апрацаваць некалькі соцень тон зерня, — кажа **начальнік камбікормавага цэха агракамбіната «Дзяржынскі» Аляксей НАВУМОВІЧ.** — Але для кожнай культуры ўстаноўлена свая аптымальная тэмпература. Яна вельмі моцна ўплывае на хуткасць і вільготнасць. Скажам, пшаніцу можна загрузіць пры тэмпературы ў 100 градусаў, і за адзін праход, які доўжыцца тры гадзіны, сушылка «здыме» 10 працэнтаў вільготнасці. А вось рапс, які з'яўляецца культурай алейнай, мы так моцна нагрэць не можам. У яго «паталок» — 85 градусаў. Самае небяспечнае — адкладанні пылу, якія непазбежна ўтвараюцца падчас работы і перашкаджаюць нармальнаму астыванню. За тэмпературай пастаянна сочыць аператар. Калі яна пачынае расці, то нагрэў тут жа выключаецца, а наш супрацоўнік ідзе вымятаць адходы.

Інспектаванне ўборачнай кампаніі ратаўнікі працягнуць да таго часу, пакуль за межы сушылак не будзе вывезена апошняя тона зерня. Як правіла, гэты час надыходзіць напрыканцы жніўня. Без кантролю не застанецца ніводнае поле.

Валяр'ян ШКЛЕННІК. *schklennik@zviazda.by*

ФАЛЬСІФІКАТ? ГЭТА НЕМАГЧЫМА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Прадавец прапанаваў адрэзаныя ад блістара капсулы, не было нават звычайнай кардоннай упакоўкі! Вядома, праўду прадпрымальны чалавек не скажа — адкуль узяў і колькі прадаў... Дый крымінальнай адказнасці пакуль ніякай. Але для звычайнага спажыўца важна нават не гэта, а абарона сябе. Фальсіфікат — не тое, што нам патрэбна, яно выраблена неафіцыйна! А калі так, то ні пра якую якасць размова, мякка кажучы, не ідзе.

Не трэба толькі думаць, што сітуацыя цалкам пушчана на самацёк. Увесь свет імкнецца сёння гарманізаваць сістэму абароту лекаў, бо ўсе пашыраюць геаграфію паставак гатовых прэпаратаў, кампанентаў для іх вырабу і ніхто не хоча рызыкаваць. Таму з'явілася міжнародная канвенцыя, да якой далучаюцца ўсё новыя і новыя дзяржавы і робяць сваю заканадаўчую базу больш жорсткай, а таксама падключаюць да кантролю за абаротам лекаў падатковыя органы і органы ўнутраных спраў. Беларускія спецыялісты ўдзельнічаюць у пасяджэннях канвенцыі. Украіна яе ўжо ратыфікавала, збіраемся гэта зрабіць і мы.

У любым выпадку, апынуўшыся ў той ці іншай краіне, мы можам не ведаць рэальнай сітуацыі з фальсіфікаванымі лекамі. Таму і рэкамендуецца браць «свае» з сабой. Аднак калі ўсё ж такі ўзнікае неабходнасць набыць лекі на выездзе, то ў першую чаргу трэба ўважліва прачытаць упакоўку, дзе абавязкова павінна быць інфармацыя аб вытворцы, яго сайт і нумары тэлефонаў. Можна нават звязацца са службай якасці, якая павінна пацвердзіць, ці была выраблена на вытворчасці гэтая серыя. А калі ў выніку ўжывання прэпарата з'явіліся скаргі, то паведамляць пра іх трэба ў аптэку або ўрачу, які выдатна ведае, што такое належная практыка фармаканагляду і што рабіць з няякасным прэпаратам, калі раптам гэта так.

На дзяржаўным узроўні кантроль якасці лекаў пачынаецца ў нас ад моманту распрацоўкі, падбору тэхналогіі, вызначэння ўласна бяспекі, эфектыўнасці і якасці падчас выпрабаванняў на акрэдытаваных базах у стацыянарах. Потым падчас рэгістрацыі адбываецца кантроль аналітычных методык — высвятляецца, што за параметры якасці, ці могуць яны сведчыць аб эфектыўнасці і бяспецы. На гэтых этапах адсейваецца каля 20 працэнтаў лекаў — небяспечных, неэфектыўных, эфектыўных не больш за існуючыя. Астатнія рэгіструюцца, і прэпараты могуць адпраўляцца ў вытворчасць.

— Лекі абавязкова рэгіструюцца ў той краіне, дзе будуць вырабляцца і прадавацца, — адзначае **намеснік начальніка ўпраўлення фармацэўтычнай інспекцыі і арганізацыі лекавага забеспячэння — начальнік аддзела фармацэўтычнай інспекцыі Міністэрства аховы здароўя Алена АЛЯКСАНДРАВА.** — Абарот лекаў ва ўсіх дзяржавах ліцэнзуецца, адбываецца кантроль Міністэрства аховы здароўя і за самімі ліцэнзіятамі — вытворцамі, складамі, дыстрыб'ютарамі, аптэкамі, бальніцамі. Ствараецца і адпаведнае нарматыўна-прававое поле — дакументы, па якіх лекі вырабляюцца, рэгіструюцца і г. д. Наша заканадаўства прыводзіцца сёння ў адпаведнасць з заканадаўствам Еўрапейскага саюза. Удасканальваюцца і дакументы па аб'яднанні рынкаў лекавых сродкаў ЕАЭС. Беларускія сертыфікаты прызнаюцца сёння ўсімі краінамі-ўдзельніцамі.

Кантроль якасці ажыццяўляюць у Беларусі 12 дзяржаўных акрэдытаваных (гэта забяспечвае давер да атрыманых вынікаў) кантрольна-аналітычных лабараторый (рэспубліканская мае ўжо міжнародны статус). Усе яны праводзяць кантроль якасці лекаў айчыннай і замежнай вытворчасці. Падыходы да ўсіх аднолькавыя — і да «Гедэон Рыхтар», і да барысаўскіх медпрэпаратаў. Праз лабараторыі праходзіць кожная партыя, якая паступае на тэрыторыю краіны. Асаблівая ўвага ўдзяляецца тым, што выводзяцца на рынак упершыню або раней прызнаныя няякаснымі. На айчынным рынку аказваюцца лекі толькі ад саміх вытворцаў або афіцыйных дыстрыб'ютараў. Нацыянальнае заканадаўства выключае магчымасць удзелу ў такой справе пасярэднікаў. Калі ж форс-мажор здарыцца падчас транспарціроўкі, гэта выявіцца падчас кантролю ў лабараторыях.

Дзякуючы такой сістэме фальсіфікаты ў Беларусь не паступалі з 2004 года. А працэнт браку сярод завезеных у краіну лекавых сродкаў не перавышае на працягу апошніх 5 гадоў 0,1. Пры паступленні няякаснай прадукцыі міністэрства фарміруе рашэнне аб канфіскацыі, інфармацыя паведамляецца пастаўшчыку, якому вяртаюць лекі або знішчаюць іх на тэрыторыі нашай краіны.

Да канца 2018 года Беларусь яшчэ працягне атрымліваць міжнародную тэхнічную падтрымку за кошт сродкаў ЕС у межах праграмы «Белмед». Чатыры дзяржаўныя кантрольна-аналітычныя лабараторыі атрымаюць у выніку самае сучаснае абсталяванне для тэсціравання лекаў. Акрамя таго, адпаведным чынам будзе падрыхтавана фармінспекцыя, якая павінна далучыцца да няўрадавай прафесійнай арганізацыі PIC/S, куды ўваходзяць ужо 49 краін.

Каля 25 працэнтаў лекавай прадукцыі Беларусь пастаўляе сёння ў 27 краін свету. Гэта было б немагчыма, калі б і на саміх фармпрадпрыемствах не дзейнічала адпаведная сістэма менеджменту якасці. Усе лабараторыі прадпрыемстваў маюць дзяржаўную акрэдытацыю. Кантроль праходзяць усе субстанцыі, дапаможныя рэчывы, упакоўка — усё, што выкарыстоўваецца ў вытворчасці. На ўсіх стадыях вытворчасці таксама адбываецца кантроль, у тым ліку па крытычных параметрах. Завяршаецца працэс вытворчасці выходным кантролем якасці па ўсіх параметрах. Урэшце, прэпарат трапляе пад кантроль тых самых лабараторый Міністэрства аховы здароўя.

«Наша прадпрыемства гарантуе адпаведнасць лекаў патрабаванням рэгістрацыйнага дасье, — кажа **намеснік дырэктара па якасці «Мінскінтэркапс» Ірына МЯЦЕЛЬСКАЯ.** — Лабараторыя можа праводзіць 36 відаў выпрабаванняў, выдаваць дазвол на рэалізацыю. Абсталяванне, якім яна аснашчана, дазваляе праводзіць паўнавартасны, шматузроўневы кантроль якасці ўсіх выпушчаных прэпаратаў, а гэта 60 найменняў».

Святлана БАРЫСЕНКА.
protas@zviazda.by

Розныя вытворцы — розны эфект?

Чаму некаторым пацыентам здаецца, што адзін прэпарат ім дапамагае, а другі, гэткі ж самы па складзе, толькі іншага вытворцы, — не? Спецыялісты Міністэрства аховы здароўя сцвярджаюць, што колькасць і якасць дзеючых і дапаможных рэчываў у абодвух прэпаратах можа быць аднолькавай, калі гэта, напрыклад, абодва генерыкі. Генерык і арыгінальны сродак не будуць мець ніякіх адрозненняў па дзеючых рэчывах, аднак па дапаможных кампанентах дапускаюцца адрозненні ў межах не больш як 5 працэнтаў. Значыць, справа не ў леках? Сапраўды, прыкладна 5 працэнтаў людзей маюць індывідуальныя асаблівасці, якія ўлічвае ўрач, калі ажыццяўляе падбор лекаў, праводзіць замену прэпарата. Аднак нельга пры гэтым рабіць абагульняючыя высновы наконт неэфектыўнасці пэўных прэпаратаў.

СОЮЗ ЕВРАЗИЯ

№ 15 (75) Вторник 8 августа 2017 года

Для читателей Беларуси, России, Казахстана, Армении, Кыргызстана

Выходит 2 раза в месяц

Издается с 26 апреля 2014 года

ПОДВЕЗЕТ И НА ЗЕМЛЕ, И В КОСМОСЕ

Фото БЕЛТА.

ОАО «СтанкоГомель» (Гомельский станкостроительный завод им. С. М. Кирова) реализует совместный проект с российским холдингом «Тульский машиностроительный завод». На снимке: главный технолог ОАО «СтанкоГомель» Александр СОТСКИЙ и заместитель главного технолога Сергей ГУЛЕВИЧ.

По результатам исследования Евразийской экономической комиссии, машиностроение — сфера экономики, обладающая наибольшим интеграционным потенциалом в ЕАЭС. Если максимальный интегральный эффект принять за 100, то вклад от машиностроения по импортозамещению за счет кооперации государств-членов составит 30 пунктов, по приросту экспорта в третьи страны — 26, по приросту взаимных поставок на внутренний рынок за счет специализации экономики государств-членов и реализации их конкурентных преимуществ — 1, по мультипликативному эффекту — 28, по потенциалу спроса на промежуточную продукцию — 15.

В этой отрасли сконцентрированы новейшие технологии и людские ресурсы. Достаточно сказать, что машиностроение занимается производством автомобилей, поездов, самолетов, ракет, судов, а также сельскохозяйственной техники, горно-шахтного оборудования и не только.

Надежда АНИСОВИЧ. *anisovich@zviazda.by*

НОВОСТИ СОЮЗА

«БелДжи». Производство в процессе

Август настал, а значит, новый завод «БелДжи» скоро начнет серийное производство автомобилей. Перед предприятием стоят амбициозные задачи по сбору 60 тысяч единиц техники в год.

Сегодня уровень локализации производства составляет 14%. Специалисты отмечают, что к ноябрю они соберут двигатель на Борисовском заводе автотракторного электрооборудования, который позволит довести уровень локализации до 30%. Именно с таким условием автомобили беспрепятственно смогут продаваться на территории ЕАЭС.

Министр экономики Беларуси Владимир ЗИНОВСКИЙ считает, что на предприятии «БелДжи» необходимо точно в срок организовать выпуск требующихся автокомпонентов, чтобы локализация составляла не менее 50%. По его мнению, не выполнив этого, белорусы сами создадут себе барьер в экспорте продукции на рынке ЕАЭС. Он подчеркнул, что строительство завода по производству автомобилей «БелДжи» становится драйвером для развития сопутствующих направлений и привлечения малого производственного бизнеса по выпуску чехлов, детских автомобильных кресел, ковриков для автомобилей, другой продукции, которую Беларусь сегодня импортирует.

По оценкам аналитиков, сегодня китайская компания «Geely», которая является соучредителем совместного производства, ежегодно поставляет в Россию около 25 тысяч автомобилей. В соответствии с бизнес-планом белорусско-китайского предприятия 90% из 60 тысяч выпускаемых автомобилей планируется экспортировать в Россию, 10% будут реализовываться в Беларуси. Это означает, что перед маркетологами встанет достаточно серьезная задача по продвижению продукции. На «БелДжи» также считают, что не менее важно сегодня начать заниматься вопросами стоимости и комплектации автомобилей, чтобы они были востребованы на рынке ЕАЭС.

Премьер-министр Беларуси Андрей КОБЯКОВ заметил, что технологически новое производство может выйти на эти объемы уже в следующем году, а в перспективе увеличить их до 120 тыс. машин в год.

Илья КРЫЖЕВИЧ. *Kryzhevich@zviazda.by*

■ Бизнес

БЕЛОРУССКИЙ ДЕТРОЙТ

В деревне под Минском собирают люксовые «Кадиллаки» и «Шевроле»

Деревушка Обчак находится всего в 10 километрах от столицы Беларуси. В ней базируется белорусско-британское автомобильное предприятие «Юнисон», которое сегодня собирает десятки самых разных современных моделей автомобилей. Наш корреспондент встретился с председателем наблюдательного совета предприятия Алексеем ВАГАНОВЫМ, чтобы выяснить, как в стране появилась такая организация, существует ли белорусское качество автомобилей и когда в Беларуси начнут собирать электрокары.

ВОЗВРАЩАЯСЬ К ИСТОКАМ

— Как появилась идея организовать завод и кто приложил руку к его созданию?

— В 1991 году компания «Лада-ОМС» стала дистрибьютором «Форда» в Беларуси. Три года мы успешно развивали дилерский бизнес, пошлины для иностранных марок в СССР были невысоки, автомобили продавались хорошо. Более того, машины разбирали прямо с автовозов. В 1994 году в независимой Республике Беларусь появились пошлины — не очень высокие, но они все равно сказались на продажах. К слову, тогда заводов по сборке иностранных автомобилей на территории бывшего Советского Союза еще не было.

В то время я с командировками часто бывал в разных городах Европы, а там уже появились первые сборочные заводы, в том числе в Польше. Мне понравилась идея, и я нашел выход через своих партнеров в Детройт — и поехал разговаривать.

— С кем вы говорили в Детройте?

— В Детройте меня и моего переводчика, английский которого, к слову, был на моем уровне, выслушал человек из среднего звена менеджмента компании «Форд». С английским языком было туго, зато была идея: здесь можно собирать автомобили, пошлин не будет, а объемы продаж значительно возрастут. У нас на кассете был записан фильм, в котором было показано, какие технологии у нас есть. И мне повезло: мимо проходил заместитель председателя правления компании «Форд» Вейн Букер. В общем, мы поговорили, и ответ был такой: ждите. Через девять месяцев пришел факс, в котором было сказано, что компания «Форд» решила посетить Украину, Беларусь и Россию и рассмотреть площадки для возможной застройки.

В течение полугода велась переписка с площадками, их смотрели специалисты. В итоге было выбрано три места, а площадка в Обчаке, по нашему мнению, была самой неудачной, поскольку многое там необходимо было переделать. Потом прилетела делегация, посмотрела все варианты, а итогом стало подписание в 1995 году в Детройте меморандума.

30 июля 1997 года завод был официально запущен. Присутствовал и Президент Беларуси, который лично проехал на автомобиле «Форд Эскорт». С того времени мы и работаем.

(Окончание на 2-й стр. «СЕ».)

НОВОСТИ СОЮЗА

Между континентами

ЦЕНТРАЛЬНАЯ И ЛАТИНСКАЯ АМЕРИКИ МОГУТ БЫТЬ БЛИЖЕ ДЛЯ ЕАЭС

Член Коллегии (министр) Евразийской экономической комиссии (ЕЭК) по интеграции и макроэкономике Татьяна ВАЛОВАЯ встретилась с послами стран, входящих в Центральноамериканскую интеграционную систему (ЦАИС), и послом Мексики. Конструктивный диалог ЕАЭС с этими странами может стать хорошей основой для роста экономического взаимодействия.

Встреча министра ЕЭК Татьяны ВАЛОВОЙ с послами стран ЦАИС и представителями дипломатических ведомств стран ЕАЭС.

Так, на встрече с Чрезвычайным и Полномочным Послом Мексики в России Нормой Брета Пенсадо Морено Татьяна Валовая отметила, что «углубление связей с Мексикой выглядит вполне закономерно, особенно с учетом значительных объемов товарооборота — около $2 млрд в год. Обе стороны имеют резервы для интенсификации взаимодействия, в рамках которого должны быть полностью использованы возможности единого рынка союза. О том, что это выгодно всем нам, говорят факты: в 2017 году уже отмечен существенный рост объемов торговли — почти на 50%».

В свою очередь, на встрече представителей дипломатических ведомств стран ЕАЭС и стран ЦАИС (Гватемалы, Гондураса, Доминиканской Республики, Коста-Рика, Никарагуа, Панамы и Сальвадора) речь также шла о развитии экономического сотрудничества. Кроме этого, Татьяна Валовая отметила возможность подписания Меморандума о взаимопонимании между двумя союзами. Он стал бы основой для углубления сотрудничества. «Ответы на глобальные вызовы эффективнее искать вместе. Уже сегодня можно сказать, что ЕАЭС, безусловно, сформировался как важный элемент международной архитектуры», — отметила министр.

Сколько льда в рыбе?

НОВЫЙ ТЕХРЕГЛАМЕНТ ДАЕТ ОТВЕТ НА ЭТОТ ВОПРОС

Масса льда (глазури) в замороженной рыбе не должна превышать 5%. Технический регламент «О безопасности рыбы и рыбной продукции» вступит в силу с 1 сентября. При этом у предпринимателей есть время подготовиться к нововведениям: документы об оценке соответствия, выданные до вступления в силу техрегламента, будут действительны до 1 сентября 2019 года.

